# Прэзентацыя кнігі "І зорнае неба над галавой...: Нарысы з гісторыі астраноміі"

*Велічная карціна зорнага неба прыцягвае ўвагу чалавека сваёй непаўторнай прыгажосцю. Чалавецтва заўсёды спрабавала і спрабуе асэнсаваць, якое месца яно займае ў Сусвеце, што такое гэты Сусвет, як ён уладкаваны, як паўстаў і ці заўсёды існаваў. Аднак астранамічныя веды акрамя высокага сэнсу - спасціжэння Сусвету - заўжды мелі і ўтылітарны характар і былі неабходныя для паўсядзённага жыцця. Менавіта пра развіццё астранамічнай навукі і ролю нашых суайчыннікаў у гэтым і расказваецца ў новай кнізе Леаніда Лаўрэша ("І зорнае неба над галавой...": Нарысы з гісторыі астраноміі / Леанід Лаўрэш. - Мінск: Лімарыус, 2013.).*

Прэзентацыя адбылася 16 траўня 2013 г. у Гарадзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Карскага. Уступнае слова сказала дырэктар бібліятэкі Лідзія Мальцава. У форме вольнага дыялогу прэзентацыю вяла доктар гістарычных навук, прафесар Святлана Марозава. Сярод іншага, яна сказала, што раней аўтар быў добра вядомы як даследчык гісторыі свайго краю, таму новая яго кніга - нечаканы для нас паварот, прысвечана гісторыі астраноміі. Нельга разглядаць гісторыю астраноміі Беларусі, ВКЛ, Рэчы Паспалітай, Расіі, СССР ізалявана, без еўрапейскай, сусветнай астраноміі. Асаблівасць навуковага почырка Лаўрэша - даследаванне гісторыі Гарадзеншчыны, Лідчыны ў еўрапейскім кантэксце. З другога боку, як Еўропа, еўрапейскія тэндэнцыі, працэсы бачыцца скрозь прызму нашага краю.





Новая кніга расказвае пра гісторыю навукі праз біяграфіі вучоных і навуковых інстытуцый, аўтар апісвае як развіццё еўрапейскія навукі уплывала на аналагічныя працэсы у нас. У кнізе - багацейшая фактура, прапрацаваны вялізны пласт літаратуры на сямі мовах. У канцы кнігі, у раздзеле дадаткі, шмат паэзіі знакамітых аўтараў, прысвечаная нашым астраномам, і наогул аўтар спрабуе паказаць, што па вялікаму рахунку навукі гуманітарныя і прыродазнаўчыя - адзіныя.

Аўтару прыйшлося адказаць на шматлікія пытанні. Сярод іншага ён сказаў, што кніга пачалася з абурэння, калі гадоў з 10 таму ён прачытаў артыкул у энцыклапедыі пра нашага славутага земляка Марціна Пачобута-Адляніцкага, дзе было напісана, што Пачобут адкрыў сузор'е. Але сузор'е адкрыць нельга, бо гэта проста пляцоўка на небе.

Вельмі цікава выступілі першыя чытачы кнігі, студэнты-гісторыкі ГрДУ Ігар Кіркоўскі і Вольга Кірысава.




У прэзентацыі сярод іншых прынялі удзел прафесар Аляксей Пяткевіч, краязнаўца і фізік Алесь Госцеў, дацэнт Наталля Івашчанка, дацэнт Іна Соркіна, гісторык Ігар Трусаў, гаспадыня галерэі "Крыга" Марыся Мацко, дактарант Інстытута гісторыі навукі Польскай акадэміі навук Андрэй Ціхаміраў.

Прэзентацыя, як заўжды, закончылася прыемным для аўтара рытуалам падпісання сваёй кнігі.

**Наш кар.**